# РОДНЫ КРАЙ ПАЧЫНАЕЦЦА З ЧАЛАВЕКА

***Г. Б. Багданава***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*galina bagdanava@mail.ru*

Фіксуецца ўвага на тым, што раённыя газеты на сёння павінны не столькі даваць інфармацыю, колькі выяўляць цікавых людзей, якія могуць быць узорам для пераймання. У прыклад прыводзіцца лагойская раённая газета «Родны край».

***Ключавыя словы:*** раённая газета; чалавек; прыроднае, каляндарнае поле; ганчарства.

# NATIVE LAND BEGINS WITH MAN

***G. B. Bagdanava***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: G. B. Bagdanava (galina bagdanava@mail.ru)*

The article focuses on the fact that regional newspapers today should not only provide information but identify interesting people who can be followed. The Logoisk district newspaper «Rodny Kray» is given as an example.

***Key words****:* district newspaper; natural, calendar field; pottery.

Сёння шмат гаворыцца пра тое, што са старонак перыядычнага друку незаўважна знікае чалавек. А па вялікім рахунку, усе падзеі, пра якія нас інфармуюць, адбываюцца дзякуючы не абстрактнай масе, а асобным людзям. І якраз раённыя газеты захоўваюць для гісторыі вобразы тых, хто сёння працуе на зямлі, і кола тых праблем, якія яго, асобнага чалавека, сёння цікавяць.

Яшчэ падчас вучобы на журфаку я з цікавасцю супрацоўнічала не толькі з рэспубліканскімі выданнямі, але і з мінскай раённай газетай. І мае камандзіроўкі, вандроўкі па Міншчыне штораз дарылі мне сустрэчы з цікавымі людзьмі, пра якіх хацелася напісаць, і я з захапленнем пісала. Хаця даводзілася разбірацца і ў праблемных сітуацыях. Праблемы вырашаліся, а ў памяці заставаліся людзі… Сёння аблічча раённых газет змянілася. Але ёсць тое, чаго не дасць ні інтэрнэт, ні рэспубліканскі друк. І гэта хацелася б акрэсліць, дакладней, выкрышталізаваць на прыкладзе

лагойскай раённай газеты «Родны край», якую з задавальненнем чытаю апошнія гады. Набыць яе можна і ў мясцовых магазінах, і ў кіёсках. Варта нагадаць, што Лагойшчына на сёння рэгіён, дзе шмат турыстычных аб’ектаў, дастаткова назваць мемарыяльны комплекс «Хатынь», спартыўныя комплексы «Лагойск», «Сілічы». У гэты край ездзяць на рыбалку, паляванне, па грыбы-ягады. Само сабой, заходзяць у крамы, купляюць мясцовую газету. Заснавальнік газеты «Родны край» – Лагойскі райвыканкам. Газета выходзіць у сераду – 8 старонак і суботу – 16 старонак (суботні выпуск с тэлепраграмай).

Дзеля даведкі, газета выходзіць з 1931 года. Мяняліся назвы («Чырвоная Лагойшчына», «Новая вёска», у гады Вялікай Айчыннай вайны падпольна выходзіла «За Савецкую Беларусь»). З 1960 быў «Ленінскі сцяг», з 1996 – «Родны край».

У кожнага з журналістаў, як сталых, як Віктар Антонавіч Несцяровіч, крэўна звязаных і з Лагойшчынай, і з газетай, і маладых, дзёрзкіх, як Валянціна Корзун, Таццяна Крэнь, ёсць свае тэмы, героі. Але вызначае ўсё кола зацікаўленняў землякоў, якое ў сваю чаргу найперш уяўляе прыроднае, каляндарнае народнае кола.

І сярод усюдыіснай рэкламы (куды ж сёння без яе) заўсёды знойдзеш матэрыялы з эфектнымі фота і пра бярозавік, грыбы-ягады, пра рыбалку, паляванне і лепшых паляўнічых, ляснічых… І яшчэ пра традыцыйныя народныя святы, пра дзяржаўныя святы і планы іх святкавання не толькі ў Лагойску, але і ў Мінску (многія ж едуць у сталіцу). Адзначаюцца віншаваннямі ад родных і блізкіх юбіляры. Толькі ў раёнцы можна ўбачыць вясельныя фота або матэрыял пра пажылую жанчыну – доўгажыхарку пад назваю «Бог узнагародзіў за нялёгкі лёс».

Упэўнена, што працяг такой традыцыі, як ганчарства, на Лагойшчыне самым непасрэдным чынам звязана з тым, што аднаго з лепшых майстроў Сямёна Саўрыцкага ў свой час падтрымала раёнка. Цяпер Саўрыцкія – гэта дынастыя ганчароў, гонар Лагойшчыны і ўсёй рэспублікі.

І калі на пачатку верасня на першай старонцы былі змешчаны матэрыялы пад назвамі «Слова – за маладымі», «Хачу дапамагаць землякам» пра выхаваццелек дзіцячага садка і будучага медыцынскага работніка, з эфектнымі фотаздымкамі, верыш у будучыню. У рубрыцы «Галоўныя каштоўнасці» друкуюцца матэрыялы пра сем’і. А як кранае аб’ява, што «Лагойскі музей збірае ўборы часоў СССР». Вядома ж, змяшчаюцца і кулінарныя рэцэпты, парады для маладых маці, новыя літаратурныя творы мясцовых аўтараў.

Лагойшчына – зямля такіх слынных людзей, як браты Тышкевічы. Рэшткі іх палаца чакаюць рэстаўратараў. І раёнка шмат піша пра гісторыю, слынных землякоў, пра мастацкія выстаўкі, якія праходзяць у музеі і Доме культуры. Лагайчанка выступае ў гурце «Стары Ольса», слынны скульптар Уладзімір Слабодчыкаў стварыў для горада скульптуру «Маці Божая Лагойская»… Пра тое, што напісаная паэма пра Паненскую гару ў Лагойску, пра расклад службы ў царкве можна дазнацца ў «Родным краі». Уражвае, як прафесійна прадстаўлена газета ў інтэрнэт-прасторы. Рэгіянальны інтэрнэт-партал «Мой родны край Лагойск», Твітар… Інтэрнэт дае магчымасць нават агучыць зафіксаваныя падзеі. На жаль, журналісты не скарысталі такую магчымасць інтэрнэту, як пераклад. Мяркую, зусім няцяжка даваць матэрыялы па-беларуску, нават калі аўтар прапануе рускі варыянт. Гэта было б больш культурна. Асобна хочацца адзначыць выдатныя фотаздымкі.

Мясцовыя навіны ўплятаюцца ў інфармацыйнае поле, якое дае БелТА. Але і адтуль, да гонару рэдакцыі, мясцовыя журналісты выбіраюць тое, што будзе цікава землякам, канкрэтным людзям, якія заўжды ёсць на старонках газеты і ў інтэрнэт-прасторы.

Сёння чытачы, асабліва маладыя, выбіраюць сабе прыклады для пераймання не толькі і не столькі у інтэрнэт-прасторы, але і на старонках газет. І журналісты мусяць быць вельмі ўважлівымі да таго, што адбываецца ў іх родным раёне. Малая радзіма, родны край пачынаецца з чалавека, асобы.

## РЕАЛИЗАЦИЯ МЕХАНИЗМА ИНТЕРАКТИВНОСТИ СОВРЕМЕННЫХ КОНВЕРГЕНТНЫХ МЕДИА: РЕГИОНАЛЬНЫЙ АСПЕКТ

***Д. А. Бакеева***

*Национальный исследовательский*
*Мордовский государственный университет им. Н. П. Огарева,*
*ул. Большевистская, 68, 430005, г. Саранск,*
*Республика Мордовия, Россия, bakeeva.di@yandex.ru*

В статье рассматриваются правила оптимизации сайта газеты «Столица С» под социальные медиа. Сайты региональных печатных СМИ автором проанализированы с точки зрения их интерактивности и интеграции с социальной площадкой «ВКонтакте». Термин «интерактивность» характеризует